# ПЛЕНАРНЫЯ ДАКЛАДЫ

**УДК 94(476)“1861/1914”**

## БЕЛАРУСКАЕ ГРАМАДСТВА НАПЯРЭДАДНІ ВАЕННА-ПАЛІТЫЧНЫХ УЗРУШЭННЯЎ І САЦЫЯЛЬНЫХ ЗРУХАЎ У ПАЧАТКУ XX СТ.

***А.Г. Каханоўскі***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь, Kohanovsky@bsu.by*

У артыкуле праведзены аналіз сацыяльных змен у беларускім грамадстве ў пачатку XX ст., вызначаны іх асноўныя кірункі, адметныя рысы. Паказана неадназначная і супярэчлівая роля палітыкі ўрада Расійскай імперыі ў вызначэнні шляху беларускага грамадства ад традыцыі да мадэрну. Асаблівы акцэнт зроблены на тым, што ад адносін сялянства Беларусі да перамен залежаў выбар шляху пераходу да індустрыяльнага грамадства. Акрамя таго, акцэнтуецца ўвага, што на мяжы XIX і асабліва ў пачатку XX ст. сярод насельніцтва павялічваецца колькасць асоб, якія імкнуліся змяніць сваё сацыяльнае становішча.

***Ключавыя словы:*** *Беларусь; беларускае грамадства; мадэрнізацыя; сацыяльныя змены; мабільнасць грамадства.*

## БЕЛОРУССКОЕ ОБЩЕСТВО НАКАНУНЕ ВОЕННО-ПОЛИТИЧЕСКИХ ПОТРЯСЕНИЙ И СОЦИАЛЬНЫХ СДВИГОВ В НАЧАЛЕ XX В.

***А.Г. Кохановский***

*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь, Kohanovsky@bsu.by*

В статье дан анализ социальных изменений в белорусском обществе в начале XX в., выделены их основные направления, отличительные черты. Показана неоднозначная и противоречивая роль политики правительства Российской империи в определении пути белорусского общества от традиции к модерну. Особый акцент сделан на том, что от отношения крестьянства Беларуси к переменам зависел выбор путей перехода к индустриальному обществу. Кроме того, акцентируется внимание на том, что на рубеже XIX и особенно в начале XX в. увеличивается среди населения количество лиц, которые стремились изменить свое социальное положение.

***Ключевые слова:*** *Беларусь; белорусское общество; модернизация; социальные изменения; мобильность общества.*

## THE BELARUSIAN SOCIETY ON THE EVE OF MILITARY AND POLITICAL UPHEAVALS AND SOCIAL CHANGES AT THE BEGINNING OF THE XX CENT.

***A. Kakhanouski***

*Belarusian State University, 4, Niezaliežnasci Ave., 220030, Minsk, Belarus, Kohanovsky@bsu.by*

The article analyses the social changes in the Belarusian society at the beginning of the XX cent., highlights their main directions and distinctive features. The author goes on to show the ambiguous and contradictory role of the Russian Empire governmental policies in determining the development path of the Belarusian society from tradition to modernity. The author put emphasis on the fact that the choice of the ways of transition to the industrial society depended on attitude of the Belarusian peasantry to the changes. In addition, the author draws attention to the fact that at the turn of the XIX, and more especially at the beginning of the XX century the number of people who aspired to change their social position increased.

***Keywords:*** *Belarus; the Belarusian society; modernization; social changes; mobility of society.*

У пачатку XX ст. назіраюцца імклівыя змены ў Беларусі. Яны закранулі практычна ўсе сферы жыцця, нават тую, дзе змены назіраліся вельмі павольна – сацыяльная ідэнтыфікацыя розных груп насельніцтва. У канцы XIX – пачатку XX ст. набірае сілу працэс разлажэння традыцыйных каштоўнасцей у беларускай вёсцы. Аднак сацыяльныя змены ў вёсцы знаходзілі апазіцыю ў тагачасных нормах паводзін, светаўспрыманні, этыцы вясковых жыхароў. Ад адносін сялянства Беларусі да прадпрымальніцтва і нараджэння новых капіталістычных адносін залежаў выбар шляху пераходу да індустрыяльнага грамадства.

На розных этапах станаўлення беларускай савецкай гістарычнай навукі заўважнай была цікавасць даследчыкаў да пытанняў сацыяльных змен у беларускім грамадстве ў пачатку XX ст., але пераважна ў кантэксце фарміравання перадумоў да рэвалюцыйных падзей 1905–1907 гг. і 1917 г. [1; 2; 8; 10; 13; 15].Толькі ў апошнія дзесяцігоддзі

назіраецца цікавасць да ўзнятай тэмы як самастойнага прадмета вывучэння, дзе сацыяльныя змены ў беларускім грамадстве разглядаюцца з улікам мадэрнізацыйнай перспектывы, як частка сістэмнага працэсу пераходу ад традыцыі да мадэрну [4; 5; 7; 9; 11; 12; 14].

У значнай ступені паказальнікам сацыяльных змен у беларускім грамадстве ў канцы XIX – пачатку XX ст., уцягнутасці яго ў мадэрнізацыйныя працэсы з'яўлялася пашырэнне пісьменнасці як сярод насельніцтва наогул, так і паміж асобнымі яго саслоўнымі і этнаканфесійнымі групамі. Выразным індыкатарам стала імклівае павелічэнне на мяжы XIX–XX стст. зацікаўленасці ў атрыманні адукацыі сярод сельскіх жыхароў, змястоўныя перамены нават у бытавым успрыманні адукаванага чалавека.

У канцы XIX – пачатку XX ст. адбываюцца значныя змены ў адукацыйнай сферы Беларусі, звязаныя з пашырэннем яе інфраструктуры, ростам абсалютнай і адноснай колькасці навучэнцаў і іх матывацыі ў авалоданні пісьменнасцю. Рост колькасці навучальных устаноў на мяжы XIX–XX стст. быў запатрабаваны павелічэннем зацікаўленасці насельніцтва, перш за ўсё сельскіх жыхароў, у магчымасці атрымаць адукацыю. Сялянства Беларусі стала ўспрымаць школу як карысную справу для сваіх дзяцей. Іншым у грамадстве становіцца таксама ўспрыманне паняцця «пісьменны чалавек»: ад валодання элементарнымі навыкамі чытаць і пісаць да набыцця прафесійных ведаў. У пачатку XX ст. робіцца надзённым пытанне аб увядзенні ўсеагульнай пачатковай адукацыі.

Назіраліся рэгіянальныя асаблівасці ў пашырэнні пісьменнасці. У апошнія дзесяцігоддзі XIX ст. найбольшымі поспехамі адрозніваліся заходнія раёны Беларусі, у пачатку XX ст. высокімі тэмпамі вылучаліся Магілёўская і Віцебская губерні. Статыстыка пашырэння пісьменнасці ў Беларусі дазволіла прасачыць заканамернасць: чым буйней быў населены пункт, тым большай назіралася ўдзельная вага сярод насельніцтва школьнікаў, а сярод вучняў дзяўчат.

Адной з выразных праяў сацыяльнай трансфармацыі беларускага грамадства ў другой палове XIX – пачатку XX ст. стала ўступленне ў стадыю дэмаграфічнага пераходу, які характарызаваўся пераходам да сучаснага тыпу ўзнаўлення насельніцтва. Беларускія губерні вызначала больш глыбокае ў параўнанні з сярэднімі паказчыкамі па еўрапейскай

частцы Расійскай імперыі пранікненне ў працэсы дэмаграфічнага пераходу, на пачатковых этапах якога зніжаецца смяротнасць, але захоўваецца дастаткова высокі ўзровень нараджальнасці. Гэта абумовіла імклівы рост, змены структуры насельніцтва беларускіх губерняў, колькасць якога ў 1858–1914 гг. павялічылася ў 2,6 разы. Па тэмпах натуральнага прыросту насельніцтва яны займалі вядучыя пазіцыі сярод губерняў еўрапейскай часткі Расійскай імперыі, маючы пры гэтым адмоўны міграцыйны баланс [5, с. 94].

Дынамізм сацыяльных працэсаў канца XIX – пачатку XX ст. выявіўся ва ўзросшай міграцыйнай актыўнасці насельніцтва, найперш сялянства. Механічнаму руху насельніцтва беларускіх губерняў быў характэрны хвалепадобны характар. Ужо ў апошнія дзесяцігоддзі XIX ст. вызначыліся рэгіянальныя асаблівасці міграцыйных патокаў з беларускіх губерняў, якія становяцца больш адчувальнымі з 1880-х гг. Унутраная міграцыя ў межах Расійскай імперыі з Віленскай і Віцебскай губерняў была скіравана найперш на паўночны захад дзяржавы – у Пецярбургскую, Ліфляндскую, Пскоўскую губерні. З Гродзенскай губерні амаль палова мігрантаў накіравалася ў прывісленскія губерні. Выхадцы з Мінскай і Магілёўскай губерняў перавагу надавалі перасяленням на поўдзень – на тэрыторыю ўкраінскіх губерняў. Эміграцыйны рух у гэты час ахапіў пераважна яўрэйскае насельніцтва. Выезд сялянства з Віленскай і Гродзенскай губерняў не набыў яшчэ масавых памераў. На мяжы XIX–XX стст. напрамак і памеры міграцыйных рухаў змяняюцца. Перш за ўсё, гэта было абумоўлена структурнымі зменамі ў фарміраванні рынку працоўнай сілы ў Расійскай імперыі і ў падыходах да вызначэння прыярытэтаў па міграцыйным пытанні ва ўрадавай палітыцы. Масавай становіцца міграцыя беларускага сялянства за мяжу, якая ахапіла пераважна Віленскую і Гродзенскую губерні і атрымала характар часовага адыходу. Невысокі попыт мясцовай прамысловасці на працоўную сілу, павелічэнне колькасці беззямельных і малазямельных сялян і адпаведна аграрнай перанаселенасці, паварот ва ўрадавай палітыцы па заахвочванні сялянскіх перасяленняў на ўсход краіны, які спалучаў эканамічныя інтарэсы з ваенна-палітычнымі, стратэгічнымі, скарачэнне міграцый за Урал вясковых жыхароў з прамысловых цэнтраў і блізкіх да іх расійскіх рэгіёнаў вывеў Магілёўскую і Віцебскую губерні на першыя пазіцыі па колькасці перасяленцаў у Сібір. Міграцыі на

поўдзень краіны і ў прывісленскія губерні адыходзяць на другі план. Аналіз статыстычнага матэрыялу з улікам яго фрагментарнасці, а таксама падлікаў беларускіх даследчыкаў дазваляе вызначыць міграцыйны баланс асноўных кірункаў перасяленняў насельніцтва Беларусі ў другой палове ХІХ – пачатку ХХ ст. У межах еўрапейскай часткі Расійскай імперыі, за выключэннем беларускіх губерняў, перасялілася каля 600–800 тыс. жыхароў Беларусі, у Сібір – каля 420–450 тыс. чалавек. У той жа час эміграцыя беларускага сялянства ў краіны Захаду ацэньваецца ў 600–800 тыс. чалавек, а з улікам эміграцыі яўрэяў выехала каля 1300 тыс. жыхароў Беларусі [5, с. 148].

На мяжы ХІХ і асабліва ў пачатку ХХ ст. павялічваецца колькасць асоб, якія імкнуліся змяніць сваё становішча, узвысіць сацыяльны прэстыж. Дадзены працэс ахапіў усе без выключэння групы насельніцтва. На магчымасць іх сацыяльных перамяшчэнняў уплывалі ўрадавыя мерапрыемствы ў эканамічнай і сацыяльна-саслоўнай сферах, узровень адукацыі асоб, іх этнаканфесійная прыналежнасць, індывідуальныя здольнасці, тэрытарыяльныя перамяшчэнні. Паступова змяншаецца залежнасць тыповага жыццёвага сцэнарыя кожнага з грамадзян ад саслоўнага паходжання і адносін да дзяржаўнай службы. На мяжы ХІХ–ХХ стст. заўважнай становіцца тэндэнцыя вызначэння сацыяльнага статусу і ролі асобы не толькі праз прыпісванне, прымацаванне да пэўнай саслоўнай, статуснай групы, але і праз механізмы дасягнення, дзякуючы асабістым якасцям. Гэта датычылася прафесійнай дзейнасці эканамічна актыўнай і адукаванай часткі грамадства.

Міжсаслоўныя пераходы былі адным з найбольш распаўсюджаных шляхоў вертыкальнай сацыяльнай мабільнасці. Магчымасці яе ў прадстаўнікоў розных саслоўяў і груп грамадства Беларусі ў канцы ХІХ – пачатку ХХ стст. не былі аднолькавымі. Урадавыя мерапрыемствы ў канфесійным пытанні, па завяршэнні «разбору шляхты», уніфікацыі саслоўна-групавога складу сельскага насельніцтва вызначылі найбольш значныя групавыя перамяшчэнні. Узыходзячая сацыяльная мабільнасць мела месца пры атрыманні вышэйшай адукацыі, паступленні на дзяржаўную службу і інш. Вядучым працэсам развіцця беларускага грамадства ў другой палове ХІХ – пачатку ХХ ст. стала нівеліроўка саслоўных адрозненняў, аднак у асяродку асобных з іх (дваранства і сялянства) адбываліся працэсы далейшай кансалідацыі і ўмацавання меж [5, с. 64–82].

Да канца XIX ст. адчувальнай стала тэндэнцыя пераўтварэння асобных саслоўяў у ганаровыя званні, але для Беларусі яна стрымлівалася абмежавальнымі мерапрыемствамі ў дачыненні католікаў і яўрэяў. Вызначылася заўважная ўніфікацыя саслоўнага складу насельніцтва беларускіх губерняў да ўзроўню цэнтральных губерняў Расійскай імперыі, аднак першыя па-ранейшаму вылучаліся больш высокай удзельнай вагой сярод жыхароў спадчыннай часткі дваранства, мяшчанства.

Пачынаючы з канца XIX ст. заняткі рознымі відамі прадпрымальніцкай дзейнасці страчвалі саслоўную афарбоўку. У той жа час для станаўлення беларускай прадпрымальніцкай эліты стрымліваючым фактарам выступала яе раз'яднанасць па нацыянальна-канфесійнай прыналежнасці. Вызначальнай для станаўлення прадпрымальніцкага асяродка стала спецыфічная структура мясцовага эканамічнага жыцця, канцэнтрацыя вытворчасцей і капіталаў на дробных прадпрыемствах. Сумарнае ўздзеянне гэтых фактараў не садзейнічала кансалідацыі буржуазіі [3, с. 80–91].

Чыноўніцтва беларускіх губерняў было разнародным па сваім сацыяльным паходжанні і этнаканфесійнай прыналежнасці. Назіралася паступовая дэмакратызацыя яго сацыяльнага складу, асабліва ў пачатку XX ст., якая была выклікана імклівым ростам дзяржаўнага апарату і ўцягненнем у яго сферу выхадцаў з падатковых саслоўяў. У сувязі з ускладненнем задач па рэалізацыі ўрадавай палітыкі, што патрабавала прафесійнай падрыхтоўкі, павялічылася значэнне адукацыйнага цэнзу пры паступленні на дзяржаўную службу. Аднак нязменным заставалася замяшчэнне пасад вышэйшых чыноўнікаў у мясцовай адміністрацыі ўраджэнцамі, як правіла, велікарускіх і прыбалтыйскіх губерняў. Розніца нацыянальнага складу сярод асобных груп чыноўнікаў была абумоўлена, перш за ўсё, магчымасцямі паступлення на службу мясцовага насельніцтва, нягледзячы на тое, што многія з іх бачылі перспектывы свайго кар'ернага росту з прылучэннем да рускага ці польскага этнакультурных асяродкаў. Неадназначны ўплыў на фарміраванне чыноўніцкага корпуса на тэрыторыі Беларусі аказалі ўрадавыя абмежаванні ў нацыянальна-канфесійнай сферы. Чыноўніцкі корпус вызначаўся стракатасцю свайго складу, што напрамую залежала ад характару ўрадавай палітыкі. Між тым, адукацыйны цэнз і

прафесіяналізацыя дзейнасці паступова аказвалі ўсё большы ўплыў на яго папаўненне [5, с. 238–243].

Станаўленне інтэлігенцыі стала вынікам сацыяльных зрухаў у грамадстве. Імклівы рост сістэмы адукацыі, развіццё медыцынскага абслугоўвання насельніцтва, узнікненне запатрабаванасці ў прыватных юрыдычных паслугах і інш., выклікалі павелічэнне колькасці адпаведных прафесійных груп, якія можна аднесці да інтэлігенцыі. Яна стала ўвасабленнем і носьбітам мадэрнізацыйных зрухаў у сферы культуры. Інтэлігенцыя садзейнічала станаўленню новай культуралагічнай парадыгмы, якая акцэнтавала ўвагу на прагрэс, веру ў навуку і тэхналогіі. На фарміраванне інтэлігенцыі Беларусі адчувальны ўплыў аказала схільнасць яе да ўдзелу ў нацыянальна-палітычных працэсах, а ў апошняй трэці XIX – пачатку XX ст. – імкненне таксама да вырашэння сацыяльных пытанняў. Гэта вызначыла апазіцыйнасць значнай часткі інтэлігенцыі да існаваўшага дзяржаўнага ладу і стала прычынай выяўлення адной з асноўных спецыфічных рыс яе фарміравання, звязанай са стратай пераемнасці паміж рознымі пакаленнямі гэтай групы. Аднак колькасныя паказчыкі фарміравання інтэлігенцыі нярэдка непасрэдна залежалі ад рэалізацыі ўрадавых мерапрыемстваў. Больш таго, пры вызначэнні прыярытэтаў развіцця сацыяльна-культурнай сферы грамадства, адпаведна і інтэлігенцыі, урадам акцэнтаваліся задачы ўмацавання рускіх дзяржаўна-палітычных асноў насуперак польскім уплывам. Інтэлігенцыя Беларусі вызначалася шматнацыянальным і шматмоўным складам, прычым беларуская нацыянальная яе частка складала меншасць, для якой на радзіме былі абмежаваныя магчымасці сацыяльнага росту [6, с. 3–20].

Асяродак рабочых быў заснаваны на асаблівым жыццёвым вопыце, вызначаўся ўласнай нормай паводзін і больш высокім у параўнанні з сельскімі жыхарамі ўзроўнем пісьменнасці. Аднак рабочы клас у значнай ступені складаўся з учарашніх сялян, якія захоўвалі заўважную сувязь з сельскагаспадарчай вытворчасцю. Фарміраванне рабочага класа ў Беларусі стрымлівалася канфесійнымі, нацыянальнымі і саслоўнымі, а адпаведна і прававымі, адрозненнямі паміж рознымі яго групамі, а таксама раз’яднанасцю па невялікіх прадпрыемствах. Аднак, нягледзячы на гэта, а таксама невысокую ўдзельную вагу сярод насельніцтва, рабочы клас Беларусі аформіўся да пачатку XX ст. як

найбольш актыўная сацыяльная сіла, уплыў якой на грамадства значна перавышаў яе колькасныя паказчыкі сярод жыхароў [7, с. 31–46].

Такім чынам, Беларусь у пачатку XX ст. развівалася ва ўмовах і пад уплывам дынамічных сацыяльных перамен. Варта падкрэсліць, што актывізацыя грамадскага жыцця напярэдадні і ў перыяд рэвалюцыйных падзей 1905–1907 гг. безумоўна наклалі таксама свой адбітак. Стабілізацыя палітычнага рэжыму ў Расійскай імперыі ў 1907–1914 гг., урадавы ціск на грамадства, апатычныя настроі сярод многіх слаёў насельніцтва ў бачанні перспектыў сацыяльных пераўтварэнняў супалі з імклівым эканамічным уздымам, пэўным ростам матэрыяльнага дабрабыту. Апошняе стала адным з фактараў таго, што нават сярод сацыяльна актыўных наёмных работнікаў на першы план выйшлі эканамічныя патрабаванні, жаданне атрымаць сацыяльныя гарантыі.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Бич, М.О. Рабочее движение в Белоруссии в 1861–1904 гг. Минск: Наука и техника, 1983.

2. Довнар-Запольский, М.В. Народное хозяйство Белоруссии, 1861–1914 гг. Минск: Изд. Госплана БССР, 1926.

3. Каханоўскі, А.Г. Міжсаслоўная сацыяльная мабільнасць насельніцтва Беларусі ў другой палове XIX–пачатку XX ст. // Российские и славянские исследования : науч. сб. Вып. 7. 2012. С. 80–91.

4. Каханоўскі, А.Г. Разгортванне мадэрнізацыйных працэсаў у Беларусі ў XIX–пачатку XX ст. // Працы гістарычнага факультэта БДУ: навук. зб. 2009. Вып. 4. С. 218–228.

5. Каханоўскі, А.Г. Сацыяльная трансфармацыя беларускага грамадства (1861–1914 гг.). Мінск : БДУ, 2013.

6. Кохановский, А.Г. Белорусская интеллигенция: самоопределение и этапы становления в XIX–начале XX в. // Працы гістарычнага факультэта БДУ: навук. зб. 2007. Вып. 2. С. 3–20.

7. Кохановский, А.Г. На пути становления индустриального общества: модернизационные процессы в Беларуси (60-х гг. XIX–начале XX вв.) // Працы гістарычнага факультэта БДУ: навук. зб. 2008. Вып. 3. С. 31–46.

8. Кернажыцкі, К.І. Да гісторыі аграрнага руху на Беларусі перад імперыялістычнай вайной. Мінск : [б. в.], 1932.

9. Носевич, В.Л. Традиционная белорусская деревня в европейской перспективе. Минск : Тэхналогія, 2004.

10. Пичета, В.И. Крестьянское и рабочее движение в эпоху 1905 года // Пр. Беларус. дзярж. ун-ту. 1926. № 11. С. 105–127.

11. Токць, С. Беларуская вёска ў эпоху зьменаў: другая палова XIX–першая траціна XX ст. Мінск, 2007.

12. Токць, С.М. Беларуская вёска на мяжы эпох: змены этнічнай свядомасці сялянства ва ўмовах распаду традыцыйнага аграрнага грамадства: па матэрыялах Гарадзеншчыны 19–першай трэці 20 ст. Гродна: ГрДУ, 2003.
13. Шабуня, К.И. Аграрный вопрос и крестьянское движение в Белоруссии в революции 1905–1907 гг. Минск, 1962.
14. Шыбека, З.В. Гарады Беларусі (60-я гады XIX–пачатак XX стагоддзяў). Мінск, 1997.
15. Экономика Белоруссии в эпоху империализма, 1900–1917 / М.Г. Матусевич [и др.]; Акад. наук БССР, Ин-т экономики; под ред. Г.Т. Ковалевского [и др.]. – Минск: Изд-во Акад. наук БССР, 1963.

**УДК 94(47+57:438)"1919/1920"**

# ПОЛЬШЧА–БЕЛАРУСЬ: ПЕРШЫЯ СПРОБЫ ЎЗАЕМАДЗЕЯННЯ ВА ЎМОВАХ РЫЖСКАГА МІРУ

***М.Э. Часноўскі***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь*

Рыжскі мір набыў некалькі ацэначных канцэптуальна-практычных узроўняў. У глабальным сэнсе яго варта лічыць адгалоскам Версальскай сістэмы міжнародных адносін, уладкаваўшай адно толькі адносіны паміж дзяржавамі-пераможцамі і праігнараваўшай стан і інтарэсы астатніх; у рэгіянальным – асобныя польскія даследчыкі схільныя характарызаваць яго як “Версальска-Рыжскую сістэму” ўладкавання – датычна адносін дзяржаў Цэнтральнай і Усходняй Еўропы пасля Першай сусветнай вайны. Беларусь і беларусаў Рыжскі мір цікавіць найперш мікраўзроўнем міждзяржаўных савецка-польскіх адносін, менавіта: увасабленнем у жыццё беларуска-польскіх дачыненняў. Мікраўзроўневая персаніфікацыя актараў вынікае з міжнародна-прававых функцый аднаго з іх – Беларусі, не набыўшай самастойнай знешняй суб’ектнасці пасля ліхалецця Першай сусветнай вайны, дзвюх рэвалюцый і дзвюх наступных войнаў, грамадзянскай ды савецка-польскай.

Сапраўды, спробы дабіцца самастойнасці беларускага боку – як пад час перамоў аб міры, так і пазней – аказаліся фактычна адхіленымі і цалкам праігнараванымі, найперш, расійскім бокам, узяўшым на сябе паўнамоцтвы і адказнасць за знешнія інтарэсы БССР.

***Ключавыя словы:*** *Рыжскі мір; “Версальска-Рыжская сістэма”; Польская Рэспубліка; БССР; РСФСР; польска-беларускае ўзаемадзеянне; знешняя суб’ектнасць БССР*